**Сёлетні XXIX Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» цяпер ужо набыў новыя старонкі сваёй гісторыі. І там не толькі паказы цікавых кінастужак, але і шэраг важных сустрэч, майстар-класаў і адметныя крокі ў далейшым супрацоўніцтве па кінавытворчасці. У дзень закрыцця фестывалю прадстаўнікі Міністэрства культуры, нацыянальнай кінастудыі, госці кінафоруму сабраліся ў Доме прэсы, каб агучыць папярэднія вынікі і бачанне яго далейшага існавання.**

# Кіно, якое ствараецца тут і намі

## НОВАЕ ГУЧАННЕ ЦІ ВЯРТАННЕ ДА ВЫТОКАЎ?

— Для мяне гэты фестываль стаў экзаменам, дзе я першы раз быў дырэктарам, кіраваў падрыхтоўкай кінафоруму, прымаў гасцей і рашэнні. Галоўнае, што мы змаглі пашырыць геаграфію нашага «Лістапада», у якім удзельнічала на гэты раз 107 краін. Я ганаруся, што наша краіна праз гэты фестываль выйшла на такі салідны ўзровень. Упэўнены, увесь свет назірае, як у нас праходзяць конкурсы, мерапрыемствы, і атрымлівае ад убачанага задавальненне, — адзначыў **генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый АЛЯКСЕЙ.** — Таксама на гэтым кінафестывалі мы правялі шэраг перагавораў, і падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве з кітайскімі калегамі, што для нас вельмі важна. Таксама падпісана пагадненне з Ігарам Угольнікавым аб вытворчасці фільма, які расправядзе яшчэ адну гісторыю пра беларускіх партызан. Дасягнуты дамоўленасці з нашымі партнёрамі з «Татарстанфільма», будзем сумесна працаваць у наступным годзе. З «Лендок» мы ўваходзім у міжнародны праект, дзе таксама ўдзельнічаюць Казахстан, Узбекістан. Шмат падзей было. І я ганаруся, што беларускім фільмам мы адкрылі сёлетні «Лістапад».

— Мы не проста падпісалі дагавор аб будучай рабоце з «Беларусьфільмам» — фільме «Бацька Мінай. Партызанская легенда», мы сумеснымі сіламі пачнём здымаць яго летам наступнага года. Спадзяёмся, што да 80-годдзя Вялікай Перамогі зможам яго прадставіць не толькі Расіі і Беларусі, але і ўсяму свету, — падзяліўся **кінарэжысёр, народны артыст Расіі Ігар УГОЛЬНІКАЎ.** — Я бачыў многія фестывалі «Лістапад» і вельмі рады таму, што яго кірунак, заяўлены ў слогане ў самым пачатку — «За гуманізм кінамастацтва, за мір і сяброўства паміж народамі», не змяніўся, і ён вельмі пасуе Мінску асабліва цяпер. Думаю, што фестываль «Лістапад» у наступным годзе па-сапраўднаму верне сабе той складнік, які ён заўсёды меў. Ёсць вельмі важная пазіцыя ў цэнтральнага кінафестывалю краіны — гэта яго візітка, яго ідэалогія. І якраз у сённяшняй сітуацыі патрэбна дэманстраваць адкрытасць Беларусі, яе ўменне даваць упэўненасць у заўтрашнім дні.

На фестывалі не толькі дэманстравалі ў кінатэатрах сталіцы і рэгіёнаў фільмы, але і зрабілі крокі ў міжнародным супрацоўніцтве для стварэння кінастужак у найбліжэйшай перспектыве. У прыватнасці Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» падпісала пагадненне з кітайскай «Sichuan Blue Eyes Film and Television Culture Media Co» аб стварэнні сумеснага кінапраекта. Папярэдне вядома, што ён будзе прымеркаваны да гадавіны з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі. А ў аснову стваральнікі плануюць пакласці гісторыю маладых людзей з Беларусі і Кітая, і праз гэта паказаць не толькі ўзаемадзеянне людзей, але і культуру нашых народаў. Здымацца кінастужку будуць на тэрыторыі абедзвюх краін, і працаваць над праектам таксама стануць спецыялісты творчых груп дзвюх дзяржаў. Афіцыйны старт міжнароднага праекта прызначаны на 20 студзеня 2024 года.

— На кінафестывалі я быў у складзе журы і прысутнічаў на ад-



Кадры з мультфільма «Вечарынка», які татарскія аўтары стварылі паводле вершаў Янкі Купалы.

крыцці. Калі на экране пачалі паказваць рэжысёраў, акцёраў, якія раней бралі ўдзел у кінафоруме, то ўсе падняліся са сваіх месцаў у знак павагі да іх, што мяне вельмі ўзрушыла. Гэта паказвае адкрытую душу беларусаў, — кажа **кітайскі акцёр кіно і тэлебачання, прадзюсар Лэй ХАНЬ.** — Ведаю, што і раней кітайскія фільмы ўдзельнічалі ў кінафестывалі, але хочацца, каб і надалей яшчэ больш акцёраў і рэжысёраў з Кітая маглі прымаць удзел у гэтым кінафоруме і дэманстраваць свае таленты. Таксама спадзяюся, што і на наступным фестывалі будзе прадстаўлена кітайскае кіно. Бо мне падабаецца, што тут заўважаеш павагу не толькі ў бок сталага пакалення кінастваральнікаў, але і да пакуль яшчэ малавядомых маладых акцёраў, рэжысёраў, сцэнарыстаў. І ўдзел у такім кінафоруме важны для іх станаўлення ў будучыні.

## ДЗЕ БЕЛАРУСКАЕ КІНО?

У пяці намінацыях прайшлі конкурсныя паказы, і іх вынікі абвясцілі на цырымоніі ўрачыстага закрыцця фестывалю. У гульнявым кіно праграму склалі 11 кінастужак з Расіі, Пакістана, Кітая, Японіі, Ірана і іншых краін. Але, на жаль, карцін беларускай вытворчасці сёлета там не прадставілі. Тут можна выказваць розныя меркаванні, але, як патлумачыла **праграмны дырэктар конкурсу ігравога кіно Таццяна КОМАНАВА**, прычынай з'яўляецца і адзін нюанс.

— Мы першапачаткова клапаціліся пра нашых гледачоў, каб паказваць ім найлепшыя фільмы, якія яшчэ ніхто не бачыў. І таму рэгламент прадугледжвае, што фільм можа быць заяўлены, толькі калі раней ён не быў у камерцыйным пракаце на тэрыторыі Беларусі. Так, было вельмі крыўдна, што наш мэтр Аляксандр Яфрэмаў не мог з гэтай прычыны прадставіць свой фільм «Ліст чакання». І гэта не адзіны фільм, зняты сёлета кінастудыяй. Але гэты нюанс прымушае нас думаць пра тое, каб некаторыя карціны выпускаць да фестывалю, і толькі потым даваць у пракат...

Аднак былі прадстаўлены кінастужкі беларускай вытворчасці і ў праграме неігравога кіно — «Лахва. Цана свабоды» Уладзіміра Луцкага і «Прэзідэнцкі аркестр» Дзмітрыя Сарокі. Фільм адкрыцця «Кіношнікі» Кірыла Халецкага браў удзел у конкурснай праграме «Кіно маладых». Пяць кінаработ прэзентавалі ў праграме анімацыйнага кіно на «Лістападзе». І, як распавёў **праграмны дырэктар анімацыйнага кіно Канстанцін АНДРУШАЧКІН**, у гэтым кірунку ў нас ёсць будучыня:

— На кінафестывалі было прадстаўлена пяць беларускіх мультфільмаў, сярод якіх тры — вытворчасці «Беларусьфільм», адзін беларуска-расійскай вытворчасці і адзін ад Свята-Елісавецінскага манастыра. І дадаткова быў паказаны яшчэ мультфільм па-беларуску расійска-татарстанскай вытворчасці, зняты па творчасці Янкі Купалы. У праграме анімацыі беларускае кіно было прадстаўлена добра. І ствараем мы яго з улікам сучасных тэндэнцый. Напрыклад, здымаючы мультыплікацыйны фільм «Тошка і яго сябры. Перазагрузка», мы выкарыстоўвалі нейрасеткі. Усяго ў праграме анімацыйнага кіно было 36 работ прадстаўлена ў конкурсе, і паказвалі іх у дзвюх праграмах: для дзяцей і дарослых (16+). Паказы адбываліся паралельна з «Лістападзікам», але на колькасць наведвальнікаў нашых сеансаў адмоўна гэта не паўплывала.

Акрамя таго гледачам прапанавалі сёлета Дні кіно Расіі, Сірыі, Казахстана, Пакістана. Атмасферу настальгіі стварылі паказы кінастужак з пазаконкурснай праграмы — фільмы з калекцыі савецкай класікі. У пазаконкурснай праграме паказалі таксама такія беларускія кінастужкі, як «Азарычы. Палеская трагедыя» Уладзіміра Каралёва, «Дачка Прыпяці» Ігара Бышнёва. Сваімі ацэнкамі і ўражаннямі ад «Лістапада» і тэндэнцый у кінаіндустрыі на сустрэчы падзяліўся **расійскі кінакрытык, кіназнаўца Аляксандр СЕМЯНЮК:**

— Сёння канчаткова наступіла эпоха сімвалічнага кіно. І ў гэтым сэнсе кітайскае кіно найбольш адпавядае часу і прыродзе такога кіно, — кажа кіназнаўца. — Таму для Беларусі вельмі добра, што



стратэгічным партнёрам з'яўляюцца не амерыканцы ці французы, у якіх цяпер сур'ёзны крызіс у кіно, а менавіта калегі з Кітая. І добра, што з боку Расіі нас прадстаўляе ў супрацоўніцтве Ігар Угольнікаў. Мяркую, найлепшы сучасны фільм пра вайну — гэта «Падольскія курсанты», бо там ёсць вобраз перадолення смерці жыццём, ёсць вобраз перамогу ў вайне і вобраз Перамогі ў самым фінале. Такое вобразнае кіно сёння павінна перавражаць. І адпаведна моладзь, якая навучаецца ў кінашколах, трэба вучыць ствараць такія фільмы... Таму, лічу, такія крокі ў супрацоўніцтве стануць для беларусаў добрым стартам для стварэння ў перспектыве новага паўнавартаснага беларускага кіно.

## ХТО І ЧАГО ВАРТЫ І КУДЫ ДАЛЕЙ?

**Кінапрадзюсар Сяргей БАГІРАЎ** таксама падхапіў гэтую тэму, адзначыўшы, што пытанне існавання і прэзентацыі беларускага кіно на такіх форумах вельмі важнае:

— Гэты «Лістапад» я бачу як рэпетыцыю перад юбілейным форумам наступнага года. Прайшла яна паспяхова. Але хацелася б мець не толькі кітайскае кіно ва ўсіх намінацыях, але і беларускае ў розных намінацыях. Хацелася б больш зносін з калегамі, бо толькі так магчыма выбудоўваць сваю далейшую перспектыву жыцця. Я штогод здымаю ў Беларусі па серыяле. Я бачу гэтых людзей і разумею, што здольныя яны на многае. Яны ўсё ўмеюць, але ім трэба даць магчымасць.

Знайшлі сваіх наведвальнікаў творчыя сустрэчы, майстар-класы, дні адкрытых дзвярэй у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і на кінастудыі «Беларусьфільм». Наведаўшы апошнюю, можна было не толькі, як кажуць, зазірнуць за кулісы стварэння кінафільмаў, пагаварыць з іх творцамі, але і паглядзець некаторыя з іх работ. Паказалі ў гэты дзень вядомыя ўжо нашаму гледачу фільмы «На другім беразе» Андрэя Хрулёва і «Ліст чакання» Аляксандра Яфрэмава. Абодва вартыя ўвагі, бо адлюстроўваюць важныя тэмы мінулага і сучасная жыцця...

— Найперш хочацца падзякаваць журы за сумленную, правільную і прынцыповую працу на сёлетнім «Лістападзе». Гэта важна, таму што на фестывалі прафесійнае журы — той самы «гамбургскі рахунак», які паказвае, хто чаго варты. Вынікі фестывалю даюць пэўныя высновы і для нас. Бо мы мелі магчымасць убачыць, як наша кіно глядзіцца на фоне іншых, хоць сёлета яно не было прадстаўлена ў намінацыі дзіцячага кіно і, на жаль, у асноўным конкурсе. Трэба зрабіць высновы, куды і як рухацца далей. Ёсць правал пакаленняў, калі мэтры ўжо паціху адыходзяць ад працы, а моладзь спрабуе, абяцае, але ці не ўсе ў беларускім кіно засталіся альбо не ўсе сябе праявілі, што таксама дае глебу для роздуму. Пакаленне рэжысёраў і сцэнарыстаў, яно проста так не з'яўляецца, — адзначае **начальнік аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына ДРЫГА.** — І тыя фільмы, якія выклікалі найбольшыя сімпатыі ў гледачоў сёлета на «Лістападзе», — гэта ўсё ж кіно з гісторыяй. Калі ёсць добры сцэнарый, то такая гісторыя зверне на сябе ўвагу. А далей ужо праца рэжысёра, як прыгожа і сучасна яе падаць. Дзве вечныя тэмы, любоў і смерць, ніколі не страцяць актуальнасці.

**Алена ДРАПКО.**